# Педагогіка, псіхалогія

*В.М.НАВУМЧЫК*

## ТВОРЧАСЦЬ ЯК МЭТА І СРОДАК ВЫХАВАННЯ

Зараз педагогі ўсё часцей звяртаюцца да новых парадыгм у адукацыі і выхаванні, асабліва, калі размова ідзе пра выхаванне творчасці. Аднак было б памылковым лічыць, што творчасць у выхаванні і адукацыі адчыніць творчай асобе шырокі шлях у стварэнне, забяспечыць умовы найлепшых стасункаў і бесканфліктнасці. Вопыт паказвае, што творчай асобе наканавана жыць ва ўмовах перманентнага канфлікту, пераадольваючы неверагодныя цяжкасці. Закранутая праблема мае шмат педагагічных адценняў. Засяродзім увагу на некаторых з іх.

Прыкладам творчасці ў навуцы і жыцці можа стаць знакаміты вынаходнік і чалавек, стваральнік новага навуковага напрамку ў тэорыі рашэння нестандартных задач Генрых Саўлавіч Альтшулер[1].

Калі ў саракавыя гады дванаццацігадовы Генрых Альтшулер пачаў сваю працу, ён не ставіў мэтай стварэнне новай навукі. Задумвалася толькі методыка, якая б дапамагала вырашаць вынаходніцкія задачы ў тэхніцы. Вучоны прапанаваў звесці праблему рашэння вынаходніцкай задачы да абмеркавання пяці пытанняў: 1) сфармуляваць задачу сцісла, але ясна; 2) апісаць, якім хацелася б бачыць працэс, каб задача была вырашана; 3) знайсці крыніцу супярэчнасці патрабаванняў, якія перашкаджаюць рашаць задачу; 4) сфармуляваць канкрэтную прычыну, якая стварае цяжкасці; 5) знайсці ўмовы, якія б выключалі гэту прычыну.

Але, нарадзіўшыся, гэта методыка нібы зажыла сваім жыццём – яна пастаянна ўдасканальвалася, пашыралася, уключала новыя інструменты, інфармацыйныя матэрыялы, элементы псіхалогіі і педагогікі і г.д. Яна знаходзіла прымяненне ў розных галінах тэхнікі, а пасля і навукі, мастацтва, эканомікі і з цягам часу ператварылася ў навуку, якая вывучае ўсё, што звязана з рашэннем творчых задач і праблем у любых галінах чалавечай дзейнасці. З'явілася і адэкватная новаму напрамку абрэвіятура – ТРВЗ – тэорыя рашэння вынаходніцкіх задач. ТРВЗ набыла шырокую вядомасць і прызнанне. Сёння ў многіх гарадах былога СССР працуюць цэнтры, якія выкарыстоўваюць ТРВЗ у практычнай дзейнасці і вучаць ТРВЗ. Пра ТРВЗ ведаюць і яе выкладаюць у Балгарыі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Германіі, ёю зацікавіліся ў Англіі, Канадзе, ЗША, Японіі; у Фінляндыі і ЗША створаны фірмы, якія зрабілі ТРВЗ асновай сваёй дзейнасці.

У ліпені 1989 г. у Петразаводску адбыўся ўстаноўчы сход, на якім была створана Асацыяцыя ТРВЗ, з'яднаўшая ўсіх, хто працаваў у гэтай галіне. Асацыяцыя, кіруючыся прынцыпамі гуманізму, паставіла перад сабою наступныя мэты: развіццё творчых здольнасцей асобы; развіццё ТРВЗ як інструмента інтэнсіфікацыі творчасці; садзейнічанне рашэнню актуальных навуковых і тэхнічных праблем.

Органам асацыяцыі з'яўляецца "Журнал ТРИЗ", які выходзіць з 1990 г. Да моманту стварэння Асацыяцыі ТРВЗ былі сфармуляваны яе асноўныя прынцыпы, не ўстарэлыя і сёння:

– развіццё ёсць павышэнне ступені ідэальнасці сістэмы, г.зн. адносін сумы выконваемых ёю карысных функцый да сумы фактараў расплаты за іх выкананне;

– існуюць аб'ектыўныя і прынцыпова пазнавальныя законы развіцця, выяўленне іх магчыма шляхам аналізу гісторыі развіцця і адпаведных інфармацыйных фондаў. Іх выкарыстанне дазволіць прагназаваць і свядома, мэтанакіравана ўдасканальваць сістэмы рознай прыроды;

– законы развіцця розных сістэм блізкія адзін да аднаго;

– першасным з'яўляецца развіццё сістэм, а не рашэнне задач (любая сістэма можа развівацца, але не любая задача можа быць вырашана);

– для рашэння задач выкарыстоўваюцца спецыяльныя алгарытмы, якія забяспечваюць паніжэнне складанасці задач шляхам аналізу і выяўлення іх глыбокай значнасці – супярэчнасцей – і рашэнне ці ліквідацыю сфармуляваных супярэчнасцей з дапамогай спецыяльных пошукавых інструментаў;

– для пошуку эфектыўных шляхоў перабудовы сістэм выкарыстоўваюцца спецыяльныя прыёмы мадэліравання структуры і функцыяніравання;

– выкарыстоўваюцца таксама спецыяльна падабраныя і арганізаваныя высокаэфектыўныя інфармацыйныя фонды: фонды прымянення фізічных, хімічных, геаметрычных, псіхалагічных, сацыяльных і інш. эфектаў; фонд прыкладаў да прыёмаў разрашэння і ліквідацыі супярэчнасцей і да стандартаў (фонд задач-аналагаў);

– для павялічэння эфектыўнасці пошукавай работы чалавека прымяняюцца спецыяльныя прыёмы памяншэння псіхалагічнай інерцыі, методыкі фарміравання творчай матывацыі і творчага мыслення;

– для забеспячэння эфектыўнасці прымянення ТРВЗ выкарыстоўваецца комплексны падыход да рашэння задач і развіцця сістэм – ад пошуку прынцыпова новых ідэй да дробнага ўдасканалення асобных вузлоў, дэталяў элементаў, ад фарміравання задумкі да канчатковай яе выпрацоўкі, удасканалення сістэмы на ўсіх этапах яе жыццёвага цыклу;

– ТРВЗ упершыню дазволіла вылучыць пошук новых рашэнняў у асобную спецыяльнасць – "шукальнік" – са сваім комплексам ведаў, навыкаў, уменняў. Асноўны метад работы гэтага спецыяліста – рашэнне задач у рэжыме дыялога са спецыялістамі ў той галіне, у якой задача сфармулявана. Шукальнік, абапіраючыся на ТРВЗ, накіроўвае пошук рашэнняў, спецыялісты даюць неабходную інфармацыю,"прывязваюць" знойдзеныя ідэі да сваёй сістэмы;

– комплекснае вывучэнне і выкарыстанне ТРВЗ у рэшце рэшт фарміруе ў чалавека так званае "ТРВЗ-мысленне", сутнасць якога ў тым, што пералічаныя прыёмы пераходзяць павольна на падсвядомы ўзровень, г.зн. нацэленасць на ідэальнае рашэнне, выяўленне і вырашэнне супярэчнасцей, выяўленне і выкарыстанне законаў развіцця, сістэмны падыход і іншыя элементы ператвараюцца ў неад'емныя часткі мыслення, праяўляюцца пры рашэнні любых задач і праблем спантанна, без намаганняў волі;

– ТРВЗ ёсць сістэма, якая сама сябе развівае. Яе развіццё падпарадкавана законам, якія яна вывучае. Таму магчыма развіццё ТРВЗ пры дапамозе яе ўласных інструментарыя і метадаў. Менавіта таму немагчымы ў яе развіцці застой: пастаянна адбываецца абнаўленне тэорыі, стварэнне новых элементаў, распаўсюджванне яе на новыя галіны прымянення;

– ТРВЗ уключае ў сябе патэнцыяльную небяспечнасць як інструмент, які павялічвае магутнасць таго, хто ім валодае, і таму вельмі важна пры яе вывучэнні выкарыстанне дасягненняў псіхалагічнай падрыхтоўкі, што паніжае імавернасць негуманнага выкарыстання ТРВЗ.

За пяцьдзесят гадоў творчасці Г.С.Альтшулер знайшоў шмат аднадумцаў, што дазволіла яму перайсці на новы ўзровень абагульнення сваіх знаходак. Аказваецца, рэкамендацыі як рабіць вынаходніцтвы маюць унікальную якасць: на іх аснове можа фарміравацца **жыццёвая стратэгія творчай асобы**

(ЖСТА), якая павінна аптымізаваць выбар жыццёвага шляху, з'яўляючыся своеасаблівым компасам у пастаянна зменлівым свеце.

Але не трэба думаць, што Альтшулер прапаноўвае канкрэтныя рашэнні такога выбару падобна таму, як вядуць сябе некаторыя "чулыя" бацькі. Наадварот, ён прапаноўвае шматварыянтнасць рашэнняў у выбары жыццёвага шляху і вылучае шэсць узаемазвязаных якасцей: 1) наяўнасць новай ці недасягнутай значнай грамадска-карыснай дастойнай мэты (ці сістэмы мэт); 2) наяўнасць праграмы дасягнення пастаўленай мэты і кантролю за выкананнем праграмы; 3) жаданне і ажыццяўленне вялікага аб'ёму работы па выкананню намечаных планаў; 4) валоданне тэхнікай рашэння задач, якія сустракаюцца на шляху да мэты; 5) здольнасць абараняць свае ідэі, цярпець грамадскае неразуменне выбранага шляху, уменне "трымаць удар", вернасць мэце; 6) адпаведнасць дасягнутых вынікаў пастаўленай мэце.

Сярод гэтых інварыянтаў творчай асобы трэба асобна вылучыць першы, менавіта ён нясе асноўную педагагічную нагрузку, нацэльваючы асобу на гуманныя, раней нікім не дасягнутыя мэты. ЖСТА аб'ядноўвае вынаходніцтва і педагогіку, распаўсюджвае вынаходніцтва, якое раней вырашала чыста тэхнічныя задачы, на галіну чалавечых узаемаадносін, аптымізацыю іх. Наяўнасць высакароднай мэты – вось што аб'ядноўвае ўсіх людзей мінулага, сённешняга часу і будучага. І прыкладаў таму шмат.

Знакаміты савецкі акадэмік Ота Юльевіч Шмідт у чатырнаццацігадовым узросце склаў план свайго жыцця. У ім было падрабязна запісана, якія кнігі трэба прачытаць, якімі навукамі авалодаць, якія праблемы вырашыць, як развівацца фізічна. Юнак падлічыў: для выканання гэтай праграмы яму спатрэбіцца 900 гадоў! Шмідт "сціснуў" праграму – зноў нямыслімы вынік: 500 гадоў. Скараціў яшчэ – атрымалася 150.

Распланаваўшы ўсё жыццё па хвілінах, ён працаваў на гранічна магчымым узроўні і да канца жыцця (Шмідт памёр у 64 гады) выканаў амаль стопяцідзесяцігадовую праграму.

Прыклад О.Ю.Шмідта падштурхоўвае нас да цікавай ідэі. А ці нельга дапусціць, што праца "на мяжы" ёсць той кручок, з дапамогай якога можна выцягнуць схаваныя ў чалавеку рэзервы? І увогуле – ці патрэбны перагрузкі? Канешне, не. Але не патрэбны і недагрузкі. Недагрузіць мозг – не толькі замарудзіць яго развіццё, але і прывучыць яго да абмежаванага мыслення, да адказу ад творчых рашэнняў. Прызвычаянасць да абмежаванага мыслення, адмова ад усяго творчага – вось што чакае чалавека, які не ўмее і не прывучыў сябе заўсёды працаваць напружана, пераадольваючы жаданне даць сабе адпачынак. Даследаванні псіхолагаў паказалі: стамленне, так званая эмацыянальная насцярожанасць, напрыклад, меншая ў студэнтаў, якія займаюцца па складаных, насычаных праграмах, чым у тых, хто вучыцца па аблегчаных.

Цікавы прыклад і другога вучонага, даследчыка Арктыкі – амерыканца Роберта Эдвіна Піры (1856–1920). Каб дасягнуць паўночнага полюса, Піры прыйшлося адмовіцца ад звычаёвых рашэнняў і знайсці выхад, адэкватны мэце.

*Праблема ў тым, што на пачатку нашага стагоддзя ў вандроўцы да* паўночнага полюса трэба было разлічваць толькі на волю і мускулы чалавека і жывёл. Але ж жывёлы, як і людзі, павінны харчавацца. Груз для жывёл, якія цягнуць сані, і для людзей перавышаў магчымасці жывёл. Дадатковыя сані – гэта дадатковыя жывёлы, а значыць, і дадатковае спажыванне харчу, г.зн. дадатковая вага на санях. Атрымліваецца замкнутае кола.

Каб яго разарваць, Піры прыдумаў "сістэму Піры". Замест адной экспедыцыі ад базавага лагера да полюса ён прапанаваў чаўночную сістэму закідвання харчу як мага далей ад лагера. Тым самым забяспечвалася магчымасць апошнім саням прайсці шлях з палёгкай да полюса па трасе, загадзя падрыхтаванай дапаможнымі атрадамі. Пабудаваўшы склады, гэтыя атрады вярталіся ў лагер. Тое, што нельга было зрабіць "монаэкспедыцыяй", адразу вырашалася пераходам да "поліэкспедыцыі".

"Сістэма Піры" выдатна зарэкамендавала сябе і пры вырашэнні іншых, не менш складаных задач. У навучальным працэсе таксама можна ўбачыць тую ж сістэму. Уласна кажучы, правільна арганізаваны вучэбны працэс заўсёды адлюстроўвае "сістэму Піры". Любыя веды грунтуюцца на трывалым фундаменце папярэдніх ведаў, жыццёвым вопыце чалавека, аналогіях, супастаўленнях. Усё гэта складае змест тых "дапаможных экспедыцый", якія дазваляюць падысці шчыльна да высакароднай мэты і дасягнуць яе.

Такім чынам, адна з асноўных якасцей творчай асобы – **гэта выбар высакароднай мэты**. Хто можа выявіць, ці з'яўляецца выбраная мэта сапраўды высакароднай, каб над ёю працаваць? – Відавочна, што гэта ўжо выбар кожнага чалавека. Так, В.А.Бухвалаў лічыць, што "мэта абавязкова павінна быць станоўчай, накіраванай на развіццё жыцця. Ці можа вучоны, ствараючы ядзерную зброю, лічыцца творчай асобай? Адказ адназначны: не. Сродкі дасягнення павінны быць станоўчымі"[2]. А вось Г.С.Альтшулер і І.М.Верткін лічаць, што "праца артыста і вынаходніка, паэта, рабочага, следчага і нават хітрыкі злачынцаў – усё гэта творчасць. Толькі творчасць розная"[3]. Таму ацэнка вынікаў творчасці патрабуе яшчэ і маральнага падыходу. Менавіта ён і з'яўляецца крытэрыем выбару высакароднай мэты.

Аднак было б наіўна думаць, што высакародныя мэты і людзей, якія іх дасягаюць, усе будуць з радасцю сустракаць, і яны заўсёды знойдуць падтрымку. Г.С.Альтшулер і І.М.Верткін адзначаюць, што "новае і супраціўленне яму – паняцці блізкія, якія ўзаемна дапаўняюць адно аднаго ў сваім адзінстве. Любая навіна, незалежна ад таго, укараняецца яна зверху ці знізу, заўсёды і абавязкова сустракае супраціўленне. І гэта закон!"[4]. Свае катэгарычныя высновы аўтары грунтуюць на тым, што знешнія абставіны заўсёды імкнуцца да сваёй стабільнасці: "Гэта праяўленне інстынкту самазахавання ў вялікіх сацыяльных сістэмах з пункту гледжання сучаснага чалавека здаецца ўродлівай з'явай. Але ж з пункту гледжання сацыяльнай сістэмы – гэта самае лагічнае дзеянне: захварэўшы арганізм імкнецца адарваць "хворыя клеткі". Творчая асоба – асоба, якая разбурае каноны,– з пункту гледжання гэтага арганізму самая сапраўдная і вельмі небяспечная "хворая клетка", і таму зразумела, чаму з ёю вядуць барацьбу па ўсіх правілах медыцынскай тактыкі, аж да "аперацыйнага ўмяшання"[5].

Аўтары, якіх нельга западозрыць у песімізме, сцвярджаюць, што гуманная, высакародная творчая асоба паяўляецца не дзякуючы намаганням грамадскіх інстытутаў, а, наадварот, насуперак ім. Творчая асоба фарміруецца ў выніку **збою ў сістэме адукацыі**, у сістэме цэнзуры, у сістэме ўзаемаадносін і ва ўсіх іншых сацыяльных сістэмах. Паяўленне творчай асобы – гэта цуд. У тым выпадку, калі гэтыя механізмы спрацоўваюць, наступае кара за творчасць – непадтрымка. Творчая асоба павінна супраціўляцца агрэсіўнасці знешніх абставін, спектр прыёмаў якіх незвычайна вялікі. Знешнія абставіны нагадваюць партнёра-шахматыста, вельмі разумнага, вынаходлівага, але тым не менш такога, які імкнецца перашкаджаць руху наперад да высакароднай мэты. Вось некаторыя з ходаў праціўніка творчай асобы.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: дрэнная пачатковая адукацыя. Стандартныя дашкольнае і школьнае выхаванне і адукацыя: кепскае, нятворчае, тэндэнцыёзнае.Выкарыстоўваюцца абавязковыя казённыя школы з навязваннем сваіх настаўнікаў, вучэбных праграм і стэрэатыпаў. Недапушчэнне ў прывілеціраваныя навучальныя ўстановы з адносна высокім узроўнем навучання.

АСНОЎНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ КЕПСКАЙ ШКОЛЫ: Рыхтаваць вучняў да запамінання матэрыялу (у процівагу добрай школе, дзе рыхтуюць вучняў, якія разумеюць матэрыял, умеюць ім карыстацца). Толькі асобныя настаўнікі здольны рыхтаваць вучняў да стварэння новага матэрыялу.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: творчая самаадукацыя. Добрыя выхаванне і адукацыя, творчыя, накіраваныя на развіццё асобы. З дапамогай бацькоў, выпадковага настаўніка, кнігі, працяглай працы ў бібліятэцы. Як мага ранейшы пачатак самастойнага чытання. Знаёмства з вялікай колькасцю казак (казкі як практыкаванне па развіццю творчага ўяўлення).

/

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: цяжкія жыццёвыя ўмовы, "пудзіла". Цяжкія жыццёвыя ўмовы ў дзяцінстве: голад, слабае здароўе, хваравітасць, неабходнасць працы з маленства. Навязванне "спадчыннай", звычайна нятворчай, прафесіі. Аперацыя "Пудзіла": варожасць дзіцячага калектыву да "несвайго", аб'яўленне байкоту "Пудзілу", ганенне, здзекванне з фізічнага недахопу, усе супраць аднаго.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: выпрацоўка ўмення даваць адпор. Заняткі якім-небудзь відам спорту дзеля паляпшэння стану здароўя. Імкненне вырвацца з неспрыяльных умоў, набыць прывабную прафесію. Атрыманне інфармацыі не толькі пра прэстыжныя прафесіі, але і пра дастойныя мэты, дасягненне якіх – справа найбольш важная.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: чалавека ператвараюць у гледача: масавая псеўдакультура, тэлебачанне, кіно, бессэнсоўнае паглынанне вольнага часу, культываванне балельшчыкаў у спорце.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: ігнараванне. Мэтанакіраваная работа, перш за ўсё – удасканаленне сістэмы чытання, набор інфармацыйнага фонду. Агульнакультурная самаадукацыя: вывучэнне гісторыі, культуры. Выпрацоўка аналітычных адносін да любой інфармацыі.Вывучэнне прававых норм.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: "Выратавальны голас родных і блізкіх": ратаванне чалавека ад выбару высакароднай мэты ў імя звычайных эталонаў жыцця; асуджэнне, пагрозы.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: фарсіраваны рух да мэты; разуменне яе маштабаў. Калі ёсць магчымасць – схіліць родных да сваёй веры.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: недахоп грошай, іх проста няма.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: выкарыстанне свабоднай прафесіі. Скарачэнне патрэб да мінімуму.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: паскораная трата часу ў сувязі з уваходам у прафесію: удзел у непатрэбных калектыўных мерапрыемствах, пікнікі, вячоркі, сходы і г.д. (ухіленне ад грамадскага жыцця расцэньваецца як адрыў ад калектыву, суправаджаецца праработкамі, вымовамі, крыўдамі).

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: максімальнае прыцягненне сябе да абранай мэты; выкарыстанне часу на афіцыйнай рабоце дзеля дасягнення дастойнай мэты.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: інтрыгі ў працоўным калектыве. Нелюбоў начальства і калег. Забіранне часу, нерваў, думак; адцягванне сіл на адказ на ўдары, на плёткі і інш.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: маральная гатоўнасць да работы ў такіх умовах. Ухіленне ад унутрыкалектыўных плётак; недалучэнне да "кааліцый".

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: паяўленне перспектываў руху па службовай лесвіцы.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: самаадмаўленне ад службовага росту дзеля захавання вольнага часу для руху да абранай мэты і свабоды прымаць асабістыя рашэнні.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: аперацыя "Камісія": арганізуецца камісія, якая не мае паўнамоцтваў нешта рашаць. Часам камісія мае паўнамоцтвы "не дапушчаць" і не мае паўнамоцтваў санкцыяніраваць укараненне. Камісія засядае, абмяркоўвае, запытвае, даследуе... Але ўсё застаецца па-ранейшаму.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: да мінімуму звесці кантакты з "камісіямі" і "камісіянерамі".

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: абыякавасць, непрыняцце, замоўчванне ці спроба дыскрэдытацыі мэты. Недапушчэнне да шырокай аўдыторыі: перашкоды да публічных выступленняў, публікацый.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: папулярызацыя мэты: артыкулы ў часопісах, газетах, пробныя лекцыі.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: доўгачасовай эвалюцыяй знешнім абставінам удаецца выхаваць людзей, што акружаюць творчую асобу, у гра-

мадства зайздроснікаў, не здольных прыняць іншы лад жыцця. Чалавек, які жыве інакш, выклікае падазронасць, пачуццё незадавальнення і жаданне паправіць яго, відазмяніць, зрабіць такім, як усе: пачуццё актыўнай, нават агрэсіўнай варожасці.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: па магчымасці, пазбяганне канфліктаў. Але галоўнае – непрыпыняльны рух наперад.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: знешнія абставіны навязваюць выкарыстанне ЭВМ – гэта прэстыжна, гэта сучасна, гэта нібы патрэбна. На самой справе – пастка для прастакоў: рух да высакароднай мэты змяняецца бясконцай валтузнёй з машынай.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: дастойная мэта – заўсёды задача высокага творчага ўзроўню. Да рашэння такіх задач ЭВМ проста не мае ніякага дачынення.

ХОД ЗНЕШНІХ АБСТАВІН: аперыцыя "Сааўтары": адхіленне вынаходцы ад яго вынаходніцтва; паяўленне псеўдааўтараў, якія прысвойваюць сабе званне першапраходцаў; зацыкліванне аўтара на доказе таго, што ён – аўтар.

АДКАЗ ТВОРЧАЙ АСОБЫ: не ўвязвацца ў вялікую бойку з "сааўтарамі", але па меры сіл неабходна біцца.

Можа скласціся думка, што канцэпцыя ненасілля ў выхаванні недапушчальная. Калі творчай асобе неабходна пераадольваць супраціўленне знешніх абставін, ці не лепш было б з дзяцінства выхоўваць чалавека ва ўмовах, набліжаных да апісаных? Справа ў тым, што насілле творыць насілле, і творчая асоба, якая мае гуманную накіраванасць, можа проста не сфарміравацца. Вельмі важна ва ўмовах свабоднага развіцця даць творчасці памацнець у чалавеку і дапамагчы яму непрымусова падысці да выбару высакароднай мэты. Я баюся нават вымавіць:"Дапамагчы абраць дастойную мэту". Гэта будзе ўжо знешняе, ненатуральнае, прымусовае.

[1] Гл.: Альтшуллер Г.С., Верткин И.М. Как стать гением: Жизненная стратегия творческой личности. Мн., 1994. С.479.

[2] Бухвалов В.А. Алгоритмы педагогического творчества: Кн. для учителя. М., 1993. С.13.

[3] Альтшуллер Г.С., Верткин И.М. Как стать гением: Жизненная стратегия творческой личности. Мн., 1994. С.28

[4] Там жа. С.110.

[5] Там жа. С.112.